КОНКУРСЫ

# Натхнёныя Калядамі

**Сярод устаноў культуры Піншчыны прайшоў дыстанцыйны конкурс-віншаванне «Пад святлом калядпай зоркі». Яго вынікі паведаміў аддзел культуры Пінскага райвыканкама.**

У творчым спаборніцтве ўдзельнічалі калядна-шчадровачныя групы 26 філіялаў клубнай сістэмы раёна. Усе яны паказалі выдатнае веданне народных традыцый, творчы падыход да выканання ўмоў конкурса-віншавання, артыстызм і высокае выканальніцкае майстэрства. У выніку былі вызначаны пераможцы ў некалькіх намінацыях. Так, лепшую калядную зорку паказаў Каменскі сельскі Дом культуры, а лепшае абрадавае дзейства – Пінкавіцкі СДК. У намінацыі «Лепшы калядны касцюм» перамог Пасеніцкі сельскі клуб. Спецыяльным прызам журы і дыпломам адзначаны ўдзельнікі народнага маладзёжнага клуба «Маладосць» Лагішынскага маладзёжнага Цэнтра культуры.

Відавочна, на Піншчыне ведаюць і захоўваюць традыцыі продкаў у калядных святкаваннях.

**Святлана ГОГАЛЬ**